**Баліць** у душы Афганістан / падрыхт. А. Шапавалава // Пастаўскі край. — 2013. — 13 лют. — С. 3.

## БАЛІЦЬ У ДУШЫ АФГАНІСТАН

***Ужо амаль 70 гадоў над Беларуссю мірнае неба. Але для паўтары сотні пастаўчан залпы вайсковых гармат адгучалі намнога менш часу назад. На ўвазе маю тых, каму давялося прайсці вогненнымі дарогамі Афганістана, выконваючы свой інтэрнацыянальны абавязак. Напярэдадні памятнай даты карэспандэнт «ПК» Алена Шапавалава пацікавілася ў былых «афганцаў», якімі былі іх ваенныя дарогі і ці трывожыць сёння душу памяць пра мінулыя падзеі.***

**Анатолій Канстанцінавіч Калмык:**

– На афганскую зямлю я ступіў 20 кастрычніка 1986 года і знаходзіўся там да самага заканчэння вайны. 7 лютага 1989-га наш полк у ліку апошніх пакінуў гэту шматпакутную краіну. Да камандзіроўкі ў Афган праходзіў службу ў Паставах, з’яўляўся камандзірам роты аховы. На такую ж пасаду ў званні капітана накіравалі ў Шынданд. У нас было трэцяе кола аховы: мы павінны былі забяспечваць спакой на мясцовым аэрадроме і ў ваенным гарадку, дзе пражываў асабовы склад. Таксама займаліся суправаджэннем тылавых харчовых калон і ваенных груп. Неаднойчы траплялі пад абстрэл душманаў, але паранены, на шчасце, не быў. Прайшло ўжо 24 гады, а Афганістан па-ранейшаму ўспамінаецца, хоць і стараюся лішні раз не вярэдзіць душу. Волю ўспамінам даю толькі падчас сустрэч з баявымі таварышамі. З многімі з іх падтрымліваю сувязь праз інтэрнэт.

**Юрый Аляксандравіч Бірук:**

– У Афганістане мне давялося пабываць ажно чатыры разы на працягу двух гадоў – у 1985-ым і ў канцы 1987-га. Гэта былі месячныя камандзіроўкі. З’яўляючыся афіцэрам 305-га авіяцыйнага палка знішчальнікаў-бамбардзіроўшчыкаў, які размяшчаўся ў Паставах, працаваў саветнікам па авіяцыі па кантракце Міністэрства абароны СССР з афганскай народнай арміяй. Займаўся пастаўкамі для яе савецкіх самалётаў «Су-7». Бываў у Шындандзе, Кабуле, Кандагары, Баграме. У маім падпарадкаванні была група з 6 афіцэраў нашага 305-га палка. Сёння амаль усе яны жывуць у Расіі, таму бачымся рэдка. Але калі прыязджаюць у Паставы, абавязкова сустракаемся і прыгадваем баявую маладосць. Стараюся не прапускаць і раённыя сустрэчы з нагоды Дня памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. З цягам часу вастрыня ўспамінаў пра тыя падзеі сціраецца, але іх усё роўна не выкрасліць з памяці.

**Віктар Дзмітрыевіч Жураў:**

– У жніўні 1984 года ў наш 305-ты авіяцыйны полк знішчальнікаў-бамбардзіроўшчыкаў, дзе я служыў старшым авіядыспетчарам у групе кіраўніцтва палётамі, прыйшла разнарадка – адправіць аднаго дыспетчара ў Афганістан. Камандаванне выбрала мяне. Так трапіў у Кандагар, дзе знаходзіўся роўна год – з 25 верасня 1984-га па 25 верасня 1985-га. Нёс дзяжурства побач з аэрадромам па забеспячэнні паветраных перавозак. У атаку з аўтаматам не хадзіў, а вось пад абстрэл душманаў трапляў амаль кожную ноч. Некалькі разоў даводзілася адбівацца ад варожых

нападаў. Тыя падзеі і сёння памятаю да драбніц, хоць прайшло ўжо шмат часу. Першыя тры гады пасля вяртання на Радзіму часта сніўся сон, што мне на галаву падаюць палаючыя верталёты. Цяпер сплю спакойна, але ўспаміны пра вайну ўсё роўна не адпускаюць, асабліва калі пачую песню або ўбачу па тэлебачанні сюжэт пра Афганістан. Праўда, расказваць пра яго не люблю.

**А. Шапавалава**